Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaj Historyi
Fond 9M64(3a)

"Ідэалогія рускага фашызму у сучасных умовах"/Пётр Касцюкові ч, доктар тэхнічных навук/, НВ, 6 мая 1998г., № 80.

Водгукі на артыкул глядзіце у НВ № 158, серада, 26 жніуня 1998г.

Як кажуць, прауда вочы рэжыць: не усім яна падабаецца. Падобная рэакцыя рускіх заваёунікау нашай дзяржаву, акупантау, каланізатарау, фашыстау, шавіністау, нацыстау была і на артыкул беларускага мучаніка-апостал Зянона Пазняка "Аб рускім імперыялізме", на артыкулы выдатнага беларускага публіцыста і вучонага-патрыёта сваей Бацькаушчыны Івана Макалові ча "О, як нам далёка яшчэ да Беларусі", ды іншых. Апаненты Пятра Касцюковіча - людзі разнага інтэлекта, відаць не ведаючыя запраўднай гісторыі Беларусі, ды, напэуна, і Расеі. Іх об'ядноўвае туга па рускай імперыі ідэалізацыя не і рускай нацыі. Маўляў, усе рускія - цацы, вызваліцелі, мучанікі-спасіцелі. Сярод дзесяткау мільёнау рускіх колькі хочаш імперыялістау, нацыстау, шавіністау, фашыстау. Іх хоць пруд прудзі і у Беларусі, асабліва сярод адстаунікоу і рускай бальшавіцкай наменклатуры.

Нацызм і шавенізм - гэта састауныя часткі фашызма, гэта ідэалогія імперыялістау, заваёунікау, захопнікау чужых краін, заусёды пад прыкрыццем добрачыннымі намерамі: вызвалення, інтэрнацыянальнага абавязку, братэрства па рэлігіі, ідэалогіі, крыві, культуры, гісторыі і г.д.

Без фашызма заваяваць і утрымаць чужую краіну і нацыю, [illegible] увясці у чужым доме свае парадкі і рабаваць яго - немагчыма. Заваёунікі у "вызваленай" краіне находзяць сабе адпаведных халуеу за добрую плату, выдаюць выгадныя сабе законы, дэкрэты, указы, распрауляюцца з неугоднымі дубінкамі, арэстамі, штрафамі, турмамі, смяротнымі прысудамі, спецыяльнымі лагерамі смерці, у якіх мучаюць голадам, холадам, здзекамі, непасільнай працай, хваробамі, травяць газам, паляць у крэматорыях. Борючымся за сваю свабоду і незалежнасць навешваюць ганебныя ярлыкі. Цяпер у модзе "нацыяналіст", "русафоб". Хаця, што датычыць нацыяналізма, то гэта нармальная з'ява, калі рэч ідзе аб інтэрэсах нацыі у сваім уласным доме. Без свайго нацыяналізма не можа існаваць ніякая незалежная дзяржава!

Прышоушы да улады незаконным шляхам, фашысты перш за усё распрауляюцца з неугоднымі, уводзяць на сродкі інфармацыі, агітацыі і прапаганды сваю манаполію і цэнзуру. На маей памяці, польскія, рускія і нямецкі

vytoki.net

фашысты,адразу пасля прыхода,уводзілі сваю тэпаніміку,па-свойму і іменамі сваіх дзеячоу называлі беларускія населеныя пункты,вуліцы, плошчы,гарады,станцыі,будавалі свае помнікі,праводзілі шалёную дэнацыяналізацыю беларускай нацыі,асабліва цераз школы і выхавaучыя установы. Фашызм - гэта не толькі крэматорыі,душагубкі,бальшэвіцкія лагеры смерці,растрэлы ні у чым не павінных людзей,псіхушкі,а гэта любы гвалт,самая замаскіраваная,утанчоная расправа над няугоднымі,гэта беззаконне,парушэнне правоу чалавека і нацый.

Палітыка Расеі у адносінах да беларускай нацыі на працягу усей нашай гісторыі і да сёняшніх дзён была фашысцкай. Зусім нядаучна гэта яскрава паказана Алесям Петрашкевічам у артыкуле"Хто каму донар і хто у кого донар?"/НВ,№160,пятніца,4 верасня 1998г.№/ і шмат іншых навуковых матэрыялах. Пётр Касцюкевіч у сваім артыкуле "Ідэалогія рускага фашызму у сучасных умовах" паказау далёка не усе праявы яго. А што датычыць патрэбавання апанентау аутара,згаданага вышэй артыкула ,забараніць выданне газеты "Народная Воля",дык яно і ёсць чыста фашыстоускае. Не яна заганяе клін между беларускім і рускім народамі,а самі рускія імперыялісты,заходнікі,нацысты,шавіністы і іх халуі. Каб быу между беларусамі і рускімі,ды і іншымі славянскімі і неславянскімі народамі,запрауды САЮЗ, ён павінен быць падпісаны не толька на паперы,а прайці цераз сэрцы абеіх народау. Мы беларусы павінны бачыць,што ён запрауды раунапрауны і узаемна выгадны. На самай жа спра справе мы бачым,што ён фашыстоускі таму,што накіраваны на ганебную русіфікацыю і ліквідацыю нашай нацыі і масавую каланізацыю нашай Краіны рускімі. Такую мэту ставілі і нямецкія фашысты:часць беларусау анямечыць,часць вынішчыць і часць перасяліць за Урал. Тоя ж самае рабілася на працягу стагоддзяу з беларускай нацыяй Расеяй: мільёны беларусау знішчана фізычна,гвалтоуна выселена із сваіго Края,зрусіфікавана. Утварыушыйся этнаграфічны вакуум запаунялі рускія заваёунікі,акупанты і каланізатары. У Беларусь яны зляталіся як мухі на мёд,занімалі кіруючыя пасады,прысвайвалі нашы землі і багацці,а беларусы як мухі гіблі у расейскіх авантюрах,лагерах смерці ГУЛАГ,а, на катарзе,у турмах,курапатах. Масава асеушыя у нашым беларускім доме рускія цяпер на рэферэндумах вырашаюць лёсаносныя для беларускай нацыі такія пытанні,як,напрыклад,аб дзяржаунасці рускай мовы у Беларусі,разумеецца на сваю карысць і расейскай імперыі. Дык ці не фашызм гэта!? Чысцейшы рускі фашыстоускі нацызм! Дык нечага на зеркало пенять,коль рожа кривая.

vytoki.net